# 2022 год
# ЮБІЛЕЙ ПЕРШАГА ВЫДАННЯ

**Звесткі з архіва**
**Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі**

*Кніга, як і чалавек, мае дату нараджэння – год, калі яна ўпершыню была апублікавана. І, канешне, у кніг бываюць юбілеі, а яны, як вядома, з’яўляюцца своеасаблівымі каталізатарамі ўспамінаў і служаць нагодай для таго, каб звярнуць увагу на выдатныя старонкі гісторыі літаратуры і кнігадрукавання і ўвогуле ацаніць «базу даных» культурнай спадчыны, асэнсаваць яе ўнікальнасць.*

*У гэтай рубрыцы прадстаўлена інфармацыя аб мастацкіх творах класікаў беларускай літаратуры, першыя выданні якіх захоўваюцца ў архіве Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі і для якіх 2022 год з’яўляецца юбілейным.*

# 100 гадоў




Купала, Я. Спадчына / Янка Купала. – Менск [Мінск] : Беларускае кааперацыйнае выдавецкае таварыства «Адраджэнне», 1922. – 221, [1] с.

# «Спадчына»: 100 гадоў

«Спадчына» – гэта чацвёрты зборнік твораў Янкі Купалы (1882–1942) і адначасова першая кніга паэта, выдадзеная ў Беларусі. Тыраж выдання склаў 4000 экзэмпляраў.

У зборнік увайшлі творы, напісаныя ў перыяд з 1905 па 1919 год. Тэмы, што ў іх закранаюцца, надзвычай разнастайныя: Першая сусветная вайна, жыццё беларускай вёскі, гістарычны лёс краіны, чалавек і свабода, каханне і маральна-этычная місія чалавека. Ёсць у зборніку і філасофскія санеты пра адвечныя пытанні чалавечага быцця – дабро і зло, жыццё і смерць, здраду і помсту.

Па сведчанні Ю. А. Алейчанка, большая частка твораў са зборніка «Спадчына» напісаны ямбічнымі памерамі (8 разнавіднасцей). У вершах «Валачобнікі», «Свайму народу» і інш., а таксама ў санетах паэт упершыню выкарыстаў рэдкія для беларускай літаратуры пяці- і шасцістопны ямб. Таксама ёсць вершы, напісаныя харэем (5 разнавіднасцей).



Янка Купала. 1929 г.

# «Спадчына»: 100 гадоў



## Зьмест


| I. | Стр. |
|---|---|
| Спадчына | 7 |
| Як цені... | 8 |
| З дня ў дзень | 9 |
| Валачобнікі | 10 |
| Брату-Беларусу | 11 |
| Свайму Народу | 13 |
| Час!.. | 15 |
| Будзь сьмелым! | 16 |
| Годзе!.. | — |
| Беларушчына | 18 |
| Моладзі | — |
| Матцы | 19 |
| Роднае слова | 20 |
| Родныя песьні | 21 |
| Усе разам. | 22 |
| Калі пачнуць | 24 |
| Ня шукай | — |
| Жар ня згас | 25 |
| Праявы | 26 |
| Апякуном | 27 |
| Песьні вайны: | |
| I. Варожбы. | 28 |
| II. Перад бурай | 29 |
| III. Склік | 31 |
| IV. Разлука | 32 |
| V. Засталіся нівы, сёлы... | 34 |
| VI. Пабоішча | 35 |
| 1914-ты | 36 |
| Вясна 1915-ая | 37 |







| | Стр. |
|---|---|
| Новы Год | 38 |
| Сярод разьюшаных сатрапаў. | 39 |
| На Сход! | 40 |
| Цару неба й зямлі | 41 |
| **II.** | |
| Сявец | 45 |
| Поле роднае | 46 |
| З песень нядолі | 47 |
| З песень мужычых | 48 |
| Куды ты рвешся? | 49 |
| Бяспутнасьць | 50 |
| З сіроцкай долі | — |
| Песьня (з народнай) | 51 |
| Аб мужыцкай долі | 52 |
| Навука | 53 |
| Думка | 55 |
| Хай-жа вам так не здаецца! | — |
| * * * (Сумна, сумна...) | 56 |
| * * * (Можам часта мы плакаць...) | — |
| Тут і там | 57 |
| У хорамах | — |
| З думак жабрака | 58 |
| Ідзе вясна | — |
| На полі тае | 59 |
| З вясной | — |
| Вясна | 60 |
| Запела вясна сваю песьню | 61 |
| Летам | 62 |
| Усюды лета | 63 |
| Дунулі сіверы | 64 |
| У вырай | — |
| У дарозе | 65 |
| Асеньнім вечарам | 66 |
| Плача восень | — |
| У досьветак | 67 |
| Віхор загуляў | 68 |
| Паяжджане | 69 |





| III. | Стр. |
|---|---|
| Млечны шлях | 73 |
| Званы | — |
| Стоногае ліха | 74 |
| На прызьбе | — |
| А ты, сіраціна... | 75 |
| Дзьве долі | 76 |
| Песьня | — |
| Крыўда | 77 |
| Коціцца крыніца... | 78 |
| Сон | 79 |
| Для Бацькаўшчыны | 80 |
| Бацькаўшчына | — |
| Пчолы | 81 |
| Наша гаспадарка | — |
| Чаму | 82 |
| Маё цярпеньне | — |
| Таварыш мой | 83 |
| Сярод магіл | — |
| На суд | 84 |
| На шляху. | — |
| З вячэрніх дум | 86 |
| На вуліцы | 87 |
| Вечар | 88 |
| Мой цень | 89 |
| На што? | 90 |
| Сьмейся! | — |
| У бяссонную ноч | 91 |
| Ўвесь да дна... | 93 |
| Блізкім і далёкім | 94 |
| Мая вера | 96 |
| Песьня й толькі... | — |
| Першыя песьні | 97 |
| Песьня | 98 |
| Мусіць трэба было | 99 |
| Дайце мне... | 100 |
| Думка | 101 |
| Куды не ўцякаю. | — |
| Я казак—не казак... | 102 |

# «Спадчына»: 100 гадоў






| | Стр. |
|---|---|
| Я й воля мая | 102 |
| Мая навука | 103 |
| IV. | |
| Я н а і я. | |
| 1. Стрэча | 107 |
| 2. У хаце | 108 |
| 3. Праталіны | 109 |
| 4. За кроснамі | 110 |
| 5. Выган у поле жывёлы | 111 |
| 6. Агляд поля | 112 |
| 7. Радаўніца | 113 |
| 8. Ворка | 114 |
| 9. Беліць палатно | 115 |
| 10. Сяўба | 116 |
| 11. Поліць агародніну | 117 |
| 12. Яблыні цьвітуць | 118 |
| 13. На сенажаці | 119 |
| 14. Краса сьвету | 120 |
| Пахаваньне | 121 |
| Быў гэта сон... | 122 |
| Успомні... | — |
| * * * (Гэй, ты, дзяўчына...) | 123 |
| Ня судзіла доля | 124 |
| А яна... | — |
| Ночцы | 125 |
| Не глядзі... | 126 |
| У зялёным садочку | 127 |
| V | |
| Магіла льва | 131 |
| Бандароўна | 146 |
| Зімою | 158 |
| Страшны вір | 167 |
| Казка аб песьні | 170 |
| «Братка й сястра» | 172 |
| Песьня | 174 |
| Адступнік | 175 |
| Рунь | 177 |
| I. Забытая карчма | 178 |
| II. » » | 179 |
| Буслы | 182 |
| Першы сьнег | 183 |





| | Стр. |
|---|---|
| VI. | |
| Разлад | 187 |
| Поэзія | 188 |
| Праступнік | 189 |
| Песьня | 190 |
| Янка Канцавы | — |
| Тутэйшы | 194 |
| Няма грошы | 196 |
| Дрэмле Юрка | 197 |
| Ня ўсе дома | 198 |
| Душачка шынкарка | 199 |
| Пры выпіўцы | 200 |
| Благая жонка | 202 |
| Кацярына | 203 |
| Прыпеўка | 204 |
| З нуды | 205 |
| Фэлькава вясельле | 206 |
| Лякарства | — |
| Дзе ня кінь—дыж кліп | 207 |
| Буралом | 208 |
| Сваякі | 209 |
| Ястраб, лісіца й певень | 210 |
| Кажух і вата | — |
| Расейскія чыгункі | — |
| Дэпутаты й грамадзяне | 211 |
| Селянін і конь | — |
| Груган і салавей | 212 |
| Асёл і яго цень | — |
| Сьвінапас і стрынатка | 213 |
| Пчолы й трутні | — |
| «Чын», гэрб і лапаць | 214 |
| Груганы | — |
| На ўсе рукі | 215 |
| * * * (Днём і ночкай...) | — |
| Эпіграма на самога сябе | — |
| * * * (Жыў музыка Налім...) | — |


Р. Ц. № 358. 1 Сав. друк. з. № 2601.

61530



## ТВОРЫ ЯНКІ КУПАЛЫ.

ЖАЛЕЙКА, збор вершаў, 154 стр. Пецярбург, 1908 г.

АДВЕЧНАЯ ПЕСЬНЯ, сцэнічная поэма ў XII-х зьявах. 32 стр. Пецярбург, 1910 г.

HUŚLAR, збор вершаў, 80 стр. Пецярбург, 1910 г.

ШЛЯХАМ ЖЫЦЬЦЯ, збор вершаў, 264 стр. Пецярбург, 1913 г.

СОН НА КУРГАНЕ, сцэнічная поэма ў 4-х абразох, 100 стр. Пецярбург, 1913 г.

ПАЎЛІНКА, сцэны з шляхоцкага жыцьця ў 2-х актах. Выданьне II-ое (у «Зборніку сцэнічных твораў», сшытак II-гі). Менск, 1918 г.

РАСКІДАНАЕ ГНЯЗДО, драма ў 5-х актах, 74 стр. Вільня, 1919 г.

ПРЫМАКІ, сцэнічны жарт у 1-м акце. У часапісі «Рунь«, №№ 5—6 і 7—8 за 1920 г.

ПЕСЬНЯ АБ ПАХОДЗЕ ІГАРА, поэма. У часопісі «Вольны Сьцяг», №№ 5 і 6 за 1921 г.

ЭРОС І ПСЫХА, сцэнічная аповесьць у 7-х разьдзелах, Ю. Жулаўскага. ***Пераклад*** з польскае мовы. (*Друкуецца*).

СПАДЧЫНА, збор вершаў, 224 стр. Менск, 1922 г.

*У перакладзе на расейскую мову:*

Янка Купала, белорусский поэт. ИЗБРАННЫЕ СТИХОТВОРЕНИЯ В ПЕРЕВОДАХ РУССКИХ ПОЭТОВ. 112 стр., Москва, 1919 г.

# «Спадчына»: 100 гадоў

Зборнік «Спадчына» пачынаецца аднаіменным вершам, напісаным 19 лістапада 1918 года ў Оршы. Гэты твор – адзін з самых знакамітых і найлепшых вершаў Янкі Купалы. Даследчыкі вызначаюць яго як напружаную споведзь багатай і тонкай душы паэта-патрыёта. Верш перакладзены на 20 моў свету. Кампазітар Ігар Лучанок напісаў музыку, песня ўвайшла ў рэпертуар ансамбля «Песняры» і стала культавай. Пазней яеераспявалі шматлікія беларускія гурты.

Ад прадзедаў спакон вякоў
Мне засталася спадчына;
Паміж сваіх і чужакоў
Яна мне ласкай матчынай.

Аб ёй мне баюць казкі-сны
Вясеннія праталіны,
І лесу шэлест верасны,
І ў полі дуб апалены.

Аб ёй мне будзіць успамін
На ліпе бусел клёкатам
І той стары амшалы тын,
Што лёг ля вёсак покатам;

І тое нуднае ягнят
Бляянне-зоў на пасьбішчы,
І крык вароніных грамад
На могілкавым кладбішчы.

І ў белы дзень і ў чорну ноч
Я ўсцяж раблю агледзіны,
Ці гэты скарб не збрыў дзе проч,
Ці трутнем ён не з’едзены.

Нашу яго ў жывой душы,
Як вечны светач-полымя,
Што сярод цемры і глушы
Мне свеціць між вандоламі.

Жыве з ім дум маіх сям’я
І сніць з ім сны нязводныя…
Завецца ж спадчына мая
Ўсяго Старонкай Роднаю.

# «Спадчына»: 100 гадоў



20 кастрычніка 2022 года ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы прайшлі XIV Міжнародныя Купалаўскія чытанні «АД ПРАДЗЕДАЎ СПАКОН ВЯКОЎ», прысвечаныя 140-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і 100-годдзю зборніка «Спадчына» (http://kupala-museum.by/kupala%d1%9eskiya-chytanni-2022/).

Падчас канферэнцыі супрацоўнікі музея паведамілі шмат цікавых фактаў аб выданні зборніка. У прыватнасці, Марыя Барткова расказала: «Выдавецтва «Адраджэнне» было створана ў сакавіку 1922 года. Таксама юбіляр. І калі мы глядзім на кнігі, якія выдаваліся, і ізноў жа адсочваем іх шлях да чытача па форзацах, то мы можам сцвярджаць, што «Спадчына» выйшла верагодней за ўсё кастрычнік – лістапад. Зрабіць цэльны кантэкст нам дапамагаюць матэрыялы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь. У апошняй рэдакцыі кніга мела 6220 радкоў. Што ў грашовым ганарары склала 3 265 500 рублёў». А Надзея Саевіч адзначыла: «У зборнік «Спадчына» Янка Купала ўклаў 155 вершаў. І з гэтых 155 вершаў 84 рукапісы захаваліся ў фондах нашага музея. Дарэчы, аднайменны верш «Спадчына» – рукапіс – атрымаў статус гісторыка-культурнай каштоўнасці 1 катэгорыі».

Яшчэ больш цікавых новых фактаў аб зборніку «Спадчына» чытачы змогуць даведацца пасля выхаду з друку зборніка матэрыялаў канферэнцыі.